САЦЫЯЛЬНЫЯ РЫЗЫКІ РЭФАРМАВАННЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З гэтай мэтай мы праводзім маніторынг заканадаўства розных краін у сферы адукацыі, аналізуем сістэмы аплаты працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў, спосабы рашэння тых ці іншых сацыяльных пытанняў, вывучаем эфектыўнасць калектыўных дагавораў. Лічу, што ёсць шмат рэчаў, якія можна было б пазычыць у нашых калег. Напрыклад, пенсійнае забеспячэнне работнікаў вышэйшай школы ва Украіне значна лепшае, чым у Расіі і Беларусі. Праўда, у сувязі з арыентацыяй Украіны на Еўрасаюз нашых суседзяў спрабуюць прымусіць змяніць пенсійнае заканадаўства, і калі гэта здарыцца, то нашы калегі могуць згубіць тое, што ўжо заваявалі. Для нас цікавасць уяўляе, напрыклад, дыферэнцыяцыя ў аплаце працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў беларускіх ВНУ, сістэма сацыяльнай абароны ў вашай краіне выкладчыкаў, якія не маюць навуковай ступені, меры дадатковай сацыяльнай абароны, прапісаныя ў калектыўных дагаворах.

Акрамя таго, у Беларусі дзейнічае сістэма дзяржаўных гарантый працаўладкавання ў выпадку рэструктурызацыі ВНУ і скарачэння кадраў. Для Расіі, напрыклад, гэтая праблема стаіць зараз асабліва востра...

Непапулярны маршрут «Дарожнай карты»

Па-першае, у Расійскай Федэрацыі з 1 верасня ўступіў у сілу новы Закон «Аб адукацыі», а па-другое, ёсць распараджэнне ўрада аб распрацоўцы так званых «дарожных карт» па павышэнні эфектыўнасці дзейнасці ўстаноў сацыяльнай сферы, уключаючы вышэйшую адукацыю і навуку. Фактычна, «дарожная карта» ўяўляе сабой даволі падрабязны план таго, што і як трэба зрабіць, каб забяспечыць рост сярэдніх заробкаў прафесарска-выкладчыцкага састаў: да 2018 года гэты паказчык павінен скласці 200% у адносінах да сярэдняга заробку ў рэгіёне. Зараз ён складае 110%, у наступным годзе павінен вырасці да 125%, у 2015 годзе — да 133% і гэтак далей. Згодна з федэральнай «дарожнай картай», да 2018 года кантынгент навучэнцаў скароціцца на 30%, а колькасць неэфектыўных ВНУ — да нуля. Па стане на сённяшні дзень у Расіі налічылі 167 (!) устаноў вышэйшай адукацыі з «прыкметамі неэфектыўнасці».

Зразумела, што ўсё гэта пацягне істотнае скарачэнне прафесарска-выкладчыцкага саставу, а тых, хто захавае сваё працоўнае месца, чакае павелічэнне аўдыторных гадзін на 28%: колькасць студэнтаў у разліку на аднаго выкладчыка павялічыцца з 9,4 да 12.

Ставяцца таксама канкрэтныя задачы па павышэнні колькасці публікацый расійскіх аўтараў у навуковых часопісах, якія змяшчаюцца ў базе даных Scopus і гэтак далей.

— У Расіі вельмі вялікая ўвага надаецца ў СМІ месцу расійскіх ВНУ ў сусветных рэйтынгах універсітэтаў. Гэтыя рэйтынгі можна крытыкаваць, але мы вымушаны з імі лічыцца, — канстатуе Ігар Катлабоўскі. — І хоць МДУ з'яўляецца прызнаным лідарам усіх расійскіх рэйтынгаў, крый Божа, калі ён здасць у сусветным рэйтынгу хоць некалькі пазіцый. Гэта будзе галоўнай навіной для першых палос расійскіх газет. Усё вышэйзгаданае, несумненна, з'яўляецца вынікам вострай канкурэнцыі на рынку адукацыйных паслуг. Адзін з галоўных паказчыкаў, на які абапіраюцца складальнікі рэйтынгаў, — гэта навука, а навука — перш за ўсё сучаснае абсталяванне. Ці варта казаць, што бюджэты ВНУ краін СНД не ідуць ні ў якое параўнанне з бюджэтамі лідараў сусветных рэйтынгаў...

Па словах Ігара Катлабоўскага, пэўны час таму у найбольш выйгрышным становішчы ў плане стыпендыяльнага забеспячэння выглядалі на постсавецкай прасторы студэнты беларускіх ВНУ. Але цяпер у Расіі прыкладна 10% ад агульнай колькасці студэнтаў атрымліваюць павышаныя акадэмічныя стыпендыі. Размова ідзе пра студэнтаў, якія дасягнулі асаблівых вынікаў у пэўных відах дзейнасці: або ў адукацыйнай, або ў спартыўнай, або ў навукова-даследчай, або ў грамадскай. Гэты вельмі сур'ёзныя даплаты і добры стымул для моладзі: калі базавая стыпендыя складае 1 100 рублёў, то надбаўка да стыпендыі дасягае 8—9 тысяч рублёў.

На думку прарэктара МДУ, сёння вельмі важна павышаць матывацыю моладзі да работы ў навуковай сферы. Важна, каб студэнты хацелі застацца працаваць у сваіх універсітэтах і развіваць навуковы патэнцыял, а для гэтага патрабуецца сістэма грашовай матывацыі, дапамога ў вырашэнні жыллёвых праблем і іншыя спосабы стымулявання.

Прафесар і палкоўнік: адчуйце розніцу...

У прынцыпе, праблема амаладжэння прафесарска-выкладчыцкага саставу актуальная і для беларускіх ВНУ (60% усіх выкладчыкаў з навуковымі ступенямі — гэта людзі ва ўзросце за 60 гадоў). І яна заканамерна звязана не толькі з заробкамі, але і з памерамі пенсій. Выкладчыкі вымушаны працаваць і ў 70 гадоў, і ў больш сталым узросце, таму што пражыць на мізэрную пенсію вельмі праблематычна.

Першы намеснік міністра адукацыі нашай краіны Аляксандр ЖУК паведаміў дэлегатам з'езда, што сярэднямесячны заробак прафесарска-выкладчыцкага саставу ў Беларусі складае зараз каля 6 млн рублёў, або 680 долараў ЗША (121% да сярэдняга заробку па краіне і 108% да сярэдніх заробкаў у прамысловасці).

Мы імкнёмся, каб прафесар атрымліваў такую ж пенсію як палкоўнік у адстаўцы. У нас не так многа дактароў навук — крыху больш за тысячу на ўсю краіну

— Сёння мы працуем над тым, каб павялічыць пенсійнае забеспячэнне для выкладчыкаў ВНУ з навуковымі ступенямі — і ў першую чаргу для прафесараў і дактароў навук. У іх пенсіі не вельмі высокія ў параўнанні з тымі ж ваеннымі, але мы ўсе ведаем, якіх інтэлектуальных выдаткаў патрабуе атрыманне навуковай ступені. Мы імкнёмся да таго, каб прафесар атрымліваў такую ж пенсію, як палкоўнік у адстаўцы. У нас не так многа дактароў навук — крыху больш за тысячу на ўсю краіну, і тым больш не ўсе яны адначасова выйдуць на пенсію, таму нагрузка на бюджэт будзе не такая істотная, а вось сацыяльны і матывацыйны эфект, наадварот, — велізарны, — падкрэсліў Аляксандр Жук.

Напярэдадні новага навучальнага года ў Беларусі ўпершыню былі распрацаваны тыпавыя штаты для ўстаноў вышэйшай адукацыі.

— Сёння эканоміка адукацыі знаходзіцца на строгім кантролі. Мы прывязалі да колькасці студэнтаў не толькі колькасць прафесарска-выкладчыцкага саставу, але і колькасць работнікаў, якія адносяцца да катэгорыі кіраўнікоў, спецыялістаў і іншых служачых. Штатная колькасць служачых ВНУ будзе вызначацца, зыходзячы з канкрэтнай колькасці студэнтаў у кожнай ВНУ і ўстаноўленага нарматыву. Для тэхнічных спецыяльнасцяў гэты нарматыў складае 8,5 студэнта на аднаго работніка ВНУ, а на гуманітарных спецыяльнасцях — 12 студэнтаў на аднаго работніка, — патлумачыў Аляксандр Жук. — Дыферэнцаваны падыход у вызначэнні суадносін колькасці студэнтаў да колькасці работнікаў ВНУ тлумачыцца рознымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры навучанні па тэхнічных і гуманітарных спецыяльнасцях. Калі мы з улікам новага нарматыву прааналізавалі сітуацыю ў ВНУ, атрымалася вельмі стракатая карціна: у падобных паміж сабой рэгіянальных універсітэтах назіраліся вельмі істотныя адрозненні ў штатах. Некаторым з іх трэба штат скарачаць, а некаторыя, наадварот, могуць дабраць работнікаў.

Аляксандр Жук таксама паведаміў, што Мінскаму гарвыканкаму было даручана будаўніцтва жылога квартала арэнднага жылля для навуковай і творчай інтэлігенцыі. Такія ж арэндныя дамы даручана пабудаваць і ў абласных цэнтрах. У Мінску ўжо распачалося будаўніцтва жылога комплексу «Магістр»: там будзе 9 жылых дамоў арэнднага тыпу на 2,3 тысячы кватэр для выкладчыкаў і маладых навукоўцаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даведка «Звязды»

Еўразійская асацыяцыя прафсаюзных арганізацый універсітэта — буйнейшае міжнароднае прафсаюзнае аб'яднанне на постсавецкай прасторы, якое аб'ядноўвае каля 70 класічных універсітэтаў з 8 краін. Свой адлік асацыяцыя вядзе з 1987 года, калі ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце адбыўся I з'езд старшыняў прафсаюзных камітэтаў універсітэтаў СССР.

■ Погляд

ТЭРАКТ У КЕНІІ ЯК ЭПІЗОД ГЛАБАЛЬНАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

Захоп ісламістамі гандлёвага цэнтра «Уэстгейт» у сталіцы Кеніі Найробі, здзейснены 21 верасня, каштаваў вельмі дорага: дзясяткі забітых і сотні параненых. Гэты дзёрзкі напад з'яўляецца чарговым сумным звяном у ланцужку тэрору, які паступова ахоплівае ўвесь свет.

Наша пакаленне, на жаль, памятае і больш крывавыя, і больш маштабныя тэрарыстычныя акты. Таму, бадай, самая жахлівая навіна: тэракты становяцца непрыемнай банальнасцю, накшталт аўтамабільных аварый. Гэта бясспрэчны доказ, што чалавецтва ўжо прызвычаілася да крыві і гвалту, а чалавечае жыццё каштуе менш за паперу, на якой надрукавана Агульная дэкларацыя правоў чалавека. Гэта — галоўная адзнака новай эпохі, трывожнай і небяспечнай, якая непрыкметна змяняе мірны пасляваенны перыяд і накладваецца дадатковым цяжарам на сусветны эканамічны крызіс.

Каб лепш зразумець прычыны сучаснага становішча і перспектывы барацьбы з сусветным тэрарызмам, зірнем на кенійскую трагедыю ў рэтраспектыве і ў рэгіянальным кантэксце.

Кенія ўпершыню сутыкнулася з міжнародным тэрарызмам 31 снежня 1980 года, калі палесцінскія баевікі выбухам у атэлі Нарфолк адпомсцілі кенійцам за іх падтрымку знакамітай ізраільскай аперацыі «Энтэбе» па вызваленні заложнікаў, захопленых у суседняй Угандзе. Але зараз у ролі галоўных тэрарыстаў выступілі ваяўнічыя ісламісты.

Афрыканская скрыня Пандоры адчынілася ў Самалі ў 1992-1995 гадах, калі джыхадзісты ўпершыню ў найноўшай гісторыі перамаглі армію ЗША і міжнародныя сілы ААН. У выніку Самалі ператварылася ў мазаіку пірацкіх рэспублік і гняздо міжнароднага тэрарызму. Па сутнасці, там запрацавала лакальная мадэль доўгатэрміновага кіруемага хаосу. Ці, як зараз высвятляецца, усё ж, хутчэй, некіруемага.

Падобная сітуацыя склалася і ў Афганістане пасля выводу савецкіх войск. У абодвух выпадках перамогу здабылі ісламісцкія радыкалы: у Афганістане — «Талібан», у Самалі — Саюз ісламскіх судоў, які пазней ператварыўся ў «Аш-Шабааб», прадстаўнікі якога і здзейснілі цяперашні тэракт у Найробі. «Шабааб» — у перакладзе «моладзь», што зноў нагадвае нам пра «Талібан» — маладых ісламскіх студэнтаў, якія змагаюцца за стварэнне сусветнага халіфату.

Узброеныя захады асобных краін і іх кааліцый пазбавіцца ад ісламісцкага экспансіянізму даюць толькі частковы і часовы эфект, адначасова спараджаючы хвалі крывавых тэрактаў у адказ. У якасці прыкладу можна прыгадаць выбух у амерыканскім пасольстве ў Кеніі з сотнямі забітых і тысячамі параненых, здзейснены 7 жніўня 1998 годзе баевікамі з «Аль-Каіды».

З гэтага моманту тэрарызм у Кеніі толькі набіраў абароты, асабліва ў апошнія два гады, што звязана з контртэрарыстычнымі аперацыямі кенійскай арміі на тэрыторыі Самалі. Менавіта помстай за гэта баевікі з «Аш-Шабааб» абвясцілі і апошнюю крывавую драму ў Найробі.

Увогуле, сітуацыя ў Кеніі вельмі паказальная і сімвалічная. Парадаксальна тое, што там джыхадзісты атакуюць не проста небагатую афрыканскую краіну, але еўрапейскую цывілізацыю ў шырокім сэнсе.

У гандлёвым цэнтры «Уэстгейт» падчас тэрарыстычнай атакі. blogs.reuters.com

Справа ў тым, што 83% кенійцаў — хрысціяне, і гэта выразная спадчына еўрапейскага каланіяльнага мінулага. Акрамя таго, атакаваны гандлёвы цэнтр належыць ізраільскім уласнікам, а сучасны Ізраіль — стварэнне еўрапейскай цывілізацыі і яе фарпост на Блізкім Усходзе.

Нельга, аднак, казаць пра вайну паміж хрысціянамі, іудзеямі і мусульманамі — гэты канфлікт даўно застаўся ў гісторыі. Зараз мы назіраем вайну паміж розным бачаннем будучыні: джыхадзісты прагнуць, каб яны і ўсё чалавецтва патрапілі ў новае шарыяцкае сярэднявечча, а еўрапейцы, якія пераступілі цераз свае хрысціянскія традыцыі, жадаюць жыць у спажывецкім пострэлігійным свеце.

Назіральнікі падкрэсліваюць яшчэ адзін парадокс апошняга тэракту — верагодна, частка тэрарыстаў была завербавана на тэрыторыі Заходняй Еўропы і ЗША. Ісламісцкія наёмнікі з Еўропы і ЗША ўсё часцей трапляюць у поле зроку СМІ. Складана знайсці больш яскравую і больш жудасную прыкмету сучаснай глабалізацыі: старое супрацьстаянне заможнай хрысціянскай Поўначы і беднага мусульманскага Поўдня канчаткова набыло рысы грамадзянскай вайны. Глабальнай грамадзянскай вайны, дзе варожыя бакі не падзелены лініяй фронту, а перамяшаны на ўсіх тэрыторыях.

Для чалавецтва гэта новы і незвычайны выклік. Час міждзяржаўных войнаў застаўся ў мінулым, а новая вайна з яе сеткавым і глабальным характарам не лічыцца з нацыянальным суверэнітэтам. Гэты выклік патрабуе ад нас мабілізацыі і рашучасці, пошуку і фармулявання прынцыпова новага адказу.

Дарэмна спадзявацца, што Беларусь абміне пагроза глабальнай грамадзянскай вайны — яна ўжо віруе ў суседніх краінах. Каб захаваць цяперашні ўзровень парадку і бяспекі, які ўспрымаецца намі як нешта натуральнае, давядзецца шмат папрацаваць, прычым не толькі чыноўнікам і сілавікам, а ўсім беларускім грамадзянам.

Беларусі патрэбна новая збалансаваная стратэгія знешнепалітычнай актыўнасці ў адпаведнасці з дзеючай Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі, якая вычарпальна характарызуе сучасныя выклікі, што паўстаюць перад краінай. Беларусі, як і раней, варта пазбягаць умяшальніцтва ў чужыя канфлікты, але, магчыма, не трэба цалкам адмаўляцца ад ўдзелу ў міжнародных міратворчых аперацыях, каб напрацаваць кадравы рэзерв спецыялістаў, загартаваных у «гарачых кропках». Таксама варта нарошчваць працоўныя кантакты ў рамках партнёрскіх праграм з суседнімі краінамі, адначасова праяўляючы пільнасць у пытаннях нелегальнай міграцыі.

Але галоўнае — варта памятаць, што бяспека нас саміх, нашых сем'яў і блізкіх залежыць ад высілкаў кожнага з нас. Гэтая формула — не проста чарговы лозунг, а норма паводзін, якую кожны беларус павінен засвойваць з дзяцінства. Гэта і асабістая адказнасць, і дапамога праваахоўным органам, і ўдзел у сістэме тэрытарыяльнай абароны, якая зараз паступова разгортваецца ў Беларусі. Гэтая справа павінна стаць не проста чарговым бюракратычным мерапрыемствам, а жывым элементам нацыянальнай бяспекі, здатным у неабходны момант мабілізаваць адказных грамадзян дзеля захавання міру ў нашай Бацькаўшчыне.

Аляксандр СІНКЕВІЧ, эканаміст, дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Sinkevich Technologies».

СВЯТА ДЛЯ СЕМ'ЯЎ З НЕВЫЛЕЧНА ХВОРЫМІ ДЗЕЦЬМІ

Напярэдадні Дня маці і Сусветнага дня хоспісаў, які адзначаецца штогод у другую суботу кастрычніка, у Мінску пройдзе свята для сем'яў з невылечна хворымі дзецьмі, якія знаходзяцца пад апекай Беларускага дзіцячага хоспіса.

Свята адбудзецца 28 верасня ў дзіцячым перасоўным луна-парку, які прадаставіць свае атракцыёны хворым дзецям. На працягу дня яны змогуць пакатацца на атракцыёне «Рамонак», паскакаць на батуце, паспрабаваць свае сілы на аўтадроме і ўзняць настрой у пакоі смеху. Забаўляць гасцей свята будуць клоўны, якія рэгулярна працуюць з невылечна хворымі дзецьмі ў рамках адной з праграм Беларускага дзіцячага хоспіса. Прыедуць на мерапрыемства таксама мінскія байкеры, якія абяцаюць пакатаць усіх ахвотных. Усяго на свяце чакаецца ад 50 да 80 дзяцей з бацькамі.

Асноўная мэта гэтага мерапрыемства — не толькі падарыць радасць цяжкахворым дзецям і іх сем'ям, але і расказаць сучаснаму свету аб філасофіі дзіцячага хоспіса. Бо хоспіс — гэта не месца для смерці, а месца для якаснага, паўнавартаснага і насычанага жыцця да апошняга яго дня.

Ініцыятарам правядзення гэтага свята выступіў рэкардсмен Кнігі Гінэса Кірыл ШЫМКО. У 2013 годзе Кірыл стаў паслом добрай волі Беларускага дзіцячага хоспіса. Ён дапамагае прыцягваць увагу грамадскасці да праблемы дзіцячых хоспісаў, а таксама ў пошуку спонсараў для будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса ў Бараўлянах. «Я ўпэўнены, што дзеці, якія сутыкаюцца ў сваім жыцці з цяжкай хваробай, нашмат мацней за самых дужых людзей планеты, якія могуць рухаць танкі, самалёты або караблі. Бо колькі трэба сіл і мужнасці, каб змагацца з хваробай да канца і пры гэтым не сумаваць! Я вельмі хачу падтрымаць усіх падапечных Беларускага дзіцячага хоспіса і абяцаю ўсім гасцям свята сюрпрыз!» — кажа Кірыл Шымко.

Свята адбудзецца 28 верасня з 11-00 да 13-00.

Месца правядзення: дзіцячы перасоўны луна-парк на скрыжаванні вул. Русіянава і Нікіфарава.

Мерапрыемства праводзіцца пры падтрымцы адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска.

Святлана БУСЬКО.

Даведка «Звязды»

ГА «Беларускі дзіцячы хоспіс» — гэта некамерцыйная дабрачынная арганізацыя, якая валодае медыцынскай ліцэнзіяй і аказвае сацыяльную, медыцынскую, псіхалагічную і духоўную дапамогу невылечна хворым дзецям і іх сем'ям. Пад апекай дзіцячага хоспіса сёння знаходзіцца каля 300 дзяцей з невылечнымі анкалагічнымі, неўралагічнымі, генетычнымі і іншымі захворваннямі.

ВАЖНА

Хоспісу можна дапамагчы ў будаўніцтве шляхам пералічэння на дабрачынны рахунак:

Р/р 3135145259013 у ААТ «БПС —Ашчадбанк», код 369, 220005 г. Мінск, бул. Мулявіна, 6, Атрымальнік: ОБО « Беларускі дзіцячы хоспіс», 223053 РБ, Мінскі р -н, в. Бараўляны, вул. Бярозавы гай 100 А, УНП 100806662, ОКПО 37342741.

■ Фінал

КУПАЛЬНІКІ — ТОЛЬКІ ДЛЯ СУДДЗЯЎ

Хто ў свеце за ўсіх прыгажэй, высвятляюць у Інданезіі

У гэту суботу, 28 верасня, на інданезійскім востраве Балі адбудзецца фінал аднаго з самых прэстыжных міжнародных конкурсаў прыгажосці — «Міс Свету». Сёлета ён праходзіць у 63-і раз і сабраў удзельніц з больш як 130 краін свету. Беларусь на конкурсе прадстаўляе 22-гадовая ўраджэнка Віцебска Марыя Вялічка, якая ўжо мае ў актыве тытулы «Міс СНД-2010» і «Міс Дабрачыннасць-2012» (на нацыянальным конкурсе «Міс Беларусь»).

«Міс Свету» сёлета мае некаторыя асаблівасці. Так, каб не абвастраць адносіны з інданезійскімі мусульманамі, якія выступалі катэгарычна супраць правядзення мерапрыемства, арганізатары шоу на ўсякі выпадак перанеслі яго з Джакарты на Балі, як мага далей ад масавых акцый пратэсту. А пазней адмовіліся ад традыцыйнага дэфіле прыгажунь у бікіні. Дакладней, выхад у купальніках быў — але ў закрытым фармаце, толькі для суддзяў. Гледачам жа дзяўчаты прадэманструюць традыцыйныя ўборы народаў Паўднёва-Усходняй Азіі — саронгі. У астатніх этапах спаборніцтва змен не адбылося: па чарзе адбываюцца конкурсы талентаў (найлепшай тут суддзі прызналі галасістую «Міс Інданезія»), спартыўнага, мадэльнага, дабрачыннасці, пераможцы якіх трапляюць у паўфінал. З іх ліку журы выбірае 5 фіналістак, кожная з якіх можа стаць новай каралевай прыгажосці.

Выпускніца Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Марыя Вялічка пакуль што не змагла ўразіць строгіх суддзяў талентамі, не ўвайшла яна і ў топ-10 удзельніц па выніках фотасесіі ў бікіні, аднак шанцы праявіць сябе ў беларускі яшчэ ёсць. Напярэдадні яшчэ некалькі конкурсных этапаў, для якіх спатрэбяцца падрыхтаваныя беларускімі дызайнерамі і стылістамі Нацыянальнай школы прыгажосці ўборы.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота з архіва Нацыянальнай школы прыгажосці і афіцыйнага сайта www.missworld.com

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

МАМА, ТАТА, ДЗЕД І ВЕЛАСІПЕД

У адзін дзень у Брэсце прайшло два велапрабегі. Адзін з іх называўся «Я, мама, тата, дзед і веласіпед». Яго арганізавалі інфармацыйны цэнтр «Экадом» і велаклуб «РаДэя». Па закліку названых арганізацый усе ахвотныя гараджане абмяняліся вопытам сямейнага актыўнага адпачынку. Удзельнікі акцыі стартавалі ад цэнтральнага ўнівермага і праехалі па цэнтры горада.

Другі веласіпедны прабег правялі Дзяржаўтаінспекцыя разам з інспекцыяй прыродных рэсурсаў. Велапрабегі былі накіраваны на прапаганду экалагічна чыстага віду транспарту.

Яна СВЕТАВА.

ВУЧЭННІ ІДУЦЬ...

У панядзелак у другой палове дня імкліва — праз сацыяльныя сеткі і па мабільнай сувязі — пачала распаўсюджвацца інфармацыя, што ў метрапалітэне нешта адбываецца.

Калега, напрыклад, паведаміла, што станцыю «Плошча Я. Коласа» электрацягнікі мінаюць, не спыняючыся, а на платформе яна заўважыла тры чамаданчыкі з надпісам «Размініраванне». Другі калега прыгадаў, што яшчэ раніцай заўважыў на станцыі «Каменная Горка» трох міліцыянераў, якія відавочна не адносіліся да «метроўскіх». Казалі, што на некаторых станцыях правяраюць багаж у пасажыраў... Нейкіх афіцыйных каментарыяў напачатку не было. Як потым высветлілася, інфармацыю пра вучэнні — а ў метро праходзілі менавіта яны — распаўсюдзіла праз афіцыйную старонку ў «Твітары» Міністэрства ўнутраных спраў: «Вучэнні праходзяць ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных. Метро гэта даказала». Пра вучэнні з'явілася інфармацыя і на старонцы ў «Твітары» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Пазней выклала інфармацыю і прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама: «Сёння ў Мінскім метрапалітэне супрацоўнікі праваахоўных органаў спрабавалі знайсці і абясшкодзіць умоўнае выбуховае прыстасаванне. Задача выканана — умоўны прадмет быў знойдзены і нейтралізаваны. У актыўнай фазе вучэнняў удзельнічалі супрацоўнікі УУС па ахове Мінскага метрапалітэна і работнікі КУП «Мінскі метрапалітэн», адпрацоўваліся дзеянні супрацоўнікаў указаных структур пры выяўленні безгаспадарчай паклажы, у якой можа знаходзіцца выбуховае прыстасаванне... Падчас вучэнняў 23 верасня ў 15 гадзін 35 хвілін доступ на плошчу «Плошча Якуба Коласа» быў абмежаваны, а электрацягнікі ішлі без прыпынку. У 16 гадзін 45 хвілін функцыянаванне станцыі было адноўлена».

24 верасня зноў з'явілася інфармацыя, што ў метро правяраюць паклажу пасажыраў. Па некаторых звестках, вучэнні быццам бы будуць доўжыцца да 26-га... На момант падрыхтоўкі матэрыялу афіцыйнай інфармацыі з гэтай нагоды не было.

ЗАДЫМЛЕННЕ Ў ТУНЭЛІ

А вось гэтае паведамленне нічога агульнага з вучэннямі не мае. Учора з-за замыкання ў электрашчыце ў метро назіралася задымленне.

На гэты раз ГУУС Мінгарвыканкама аператыўна адрэагавала на здарэнне. «У 12 гадзін 40 хвілін у дзяжурную часць паступіла паведамленне аб задымленні тунэля, што прымыкае да станцыі метро «Усход». Згодна з папярэдняй інфармацыяй, задымленне звязана з тэхнічнымі непаладкамі — кароткім замыканнем электрашчыта, размешчанага ў тунэлі за некалькі метраў ад станцыі. Рух электрацягнікоў па першай лініі быў спынены, доступ пасажыраў на станцыі гэтай лініі абмежаваны».

Сяргей РАСОЛЬКА.

78-ГАДОВУЮ ЯГАДНІЦУ ЗНАЙШЛІ НА ШОСТЫЯ СУТКІ

Дзве знаёмыя мінчанкі вырашылі паехаць на электрычцы ў Асіповіцкі раён па ягады. Даехалі да станцыі Вярхі і разышліся ў розныя бакі. Вяртацца дадому адной з аматарак «ціхага палявання» прыйшлося ў адзіноце: яе прыяцелька ў прызначаны час на станцыю не выйшла...

Ніякіх вестак ад пенсіянеркі не было і на наступны дзень. Мабільны тэлефон не адказваў, бо, як высветлілася пазней, быў разраджаны. Сваякі неадкладна звярнуліся ў міліцыю.

— Зніклую мінчанку шукалі супрацоўнікі Асіповіцкага РАУС, МНС, вайскоўцы, — паведаміў **начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама Раман ПОСАХАЎ.** — Не сядзелі склаўшы рукі і сваякі жанчыны. Багністая і непраходная мясцовасць, куды прабрацца чалавеку практычна немагчыма, аглядалася з дапамогай беспілотнага самалёта. Знайшлі 78-гадовую ягадніцу, якая заблудзіла, толькі на шостыя суткі. Нягледзячы на значны ўзрост, яна не страціла надзею і ўсе гэтыя дні спрабавала знайсці выхад з густога лесу.

Жанчыне неадкладна аказалі першую медыцынскую дапамогу, затым даставілі ў бальніцу. На шчасце, працяглай шпіталізацыі не спатрэбілася, і пенсіянерку ў суправаджэнні сваякоў адпусцілі дадому.

ЦЕЛА НЕМАЎЛЯЦІ ЗНАЙШЛІ СЯРОД СМЕЦЦЯ

Цела нованароджанай дзяўчынкі знайшлі ў кантэйнеры для смецця ў Нароўлі. Аб гэтым «Звяздзе» паведаміла афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА.

Аб страшнай знаходцы ў міліцыю паведаміла пенсіянерка. «Аператыўна-следчая група неадкладна выехала па выкліку, — кажа Марыя Крываногава. — Там, на месцы, у кантэйнеры для смецця, сапраўды, ляжала цела немаўляці, запакаванае ў палімерны мяшок чорнага колеру. У дадзены момант праводзіцца расследаванне».

Надзея ПАЎЛАВА.

САФАРЫ НА... АВЕЧАК

Да 4 гадоў пазбаўлення волі пагражае маладым жыхарам Шумілінскага раёна, якія палявалі на... авечак, што належаць гаспадарцы.

...У той дзень хлопцы каталіся на старэнькім «Масквічу». У пасажыра аўто пры сабе была паляўнічая стрэльба. Убачыўшы авечак, якія мірна пасвіліся каля вёскі Завань, гаспадар зброі папрасіў вадзіцеля спыніць аўтамабіль. Вечарам ён збіраўся паесці шашлыку...

Чалавек са зброяй пракраўся па канаве ў бок авечак і, дачакаўшыся, пакуль пастухі адыдуць, прысеўшы, зрабіў стрэл. Авечка ўпала, стралок паклікаў кіроўцу аўто дапамагчы яму данесці «трафей» да машыны. Аднак пільныя пастухі, здзіўленыя такой дзёрзкай выхадкай, кінуліся даганяць зладзеяў. Хлопцам ледзь удалося з'ехаць з месца «сафары». Пастухі паведамілі аб тым, што адбылося, у міліцыю.

— Неўзабаве вадзіцель аўто быў затрыманы. Дарэчы, статак тады зменшыўся на дзве авечкі, бо стрэлам была паранена яшчэ адна жывёліна, якую пасля прыйшлося прырэзаць. У дачыненні да гэтых грамадзян заведзена крымінальная справа. Каб пазбегнуць крымінальнай адказнасці гора-паляўнічы (які, аказваецца, раней меў судзімасці) спрабаваў схавацца на тэрыторыі Расіі, аднак хутка быў затрыманы і перададзены беларускім органам следства. Аматарам сафары пагражае пакаранне ў выглядзе папраўчых работ на тэрмін да 2 гадоў, або арышт — ад 3 да 6 месяцаў, або абмежаванне волі — да 4 гадоў, або пазбаўленне волі на той жа тэрмін, — паведаміла **Наталля Сеўрукова, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці.**

Аляксандр ПУКШАНСКІ.